Источник: **«Звязда» - 2013-06-07**

## Рэдкія птушкі жывуць пад Мінскам

Здавалася б, у Смалявіцкім раёне, які даўно лічыцца прыгарадным, дзе ўзводзіцца першы горад-спадарожнік Мінска і дзе нядаўна распачалося будаўніцтва ўнікальнага па маштабах і мэтах беларуска-кітайскага тэхнапарка, навакольнае асяроддзе будзе паступова адступаць пад націскам урбанізацыі.

Аднак прырода проста так не здае свае пазіцыі. І вось навукоўцамі на тэрыторыі раёна (а дакладней, на злучэнні рэк Гайны і Усяжа) былі адкрыты месцы гнездавання дупеля. Нагадаем, гэты від птушак уключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Спецыялісты прыйшлі да высновы, што для захавання мясцовай папуляцыі дупеля неабходна правесці работы па падтрыманні яго месца пражывання.

І днямі яны былі праведзены. У раёне адбылася прыродаахоўная акцыя "Вернем рэдкім птушкам іх дом!", прысвечаная Сусветнаму дню навакольнага асяроддзя. Як паведаміла Ірына Новак, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю міжнароднага праекта "Біяразнастайнасць", у акцыі бралі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства лясной гаспадаркі, Нацыянальнай акадэміі навук. Ірына Новак нагадала, што побач з дупелем у суседніх лясах пражываюць яшчэ чорны бусел, арлан-белахвост, малы падворлік. Яны таксама ўключаны ў Чырвоную кнігу. А тэрыторыя зліцця рэк Гайны і Усяжа з'яўляецца для іх кармавымі ўгоддзямі. Такім чынам, акцыя садзейнічала ўмацаванню папуляцый і гэтых відаў птушак.

**Леанід Тугарын.**